International House

# Newsletter

Главная → О школе → Проекты → Newsletter

International House **Newsletter**

## Autumn 2012

## INTEGRA NEWS

Праект Інтэгра "Комплекс інтэграцыі мігрантаў - базавая мова для рашэння фінансавых пытанняў" быў арганізаваны, каб дапамагчы мігрантам паскорыць іх інтэграцыю, у прыватнасці, у фінансавых пытаннях. У сучасным грамадстве з глабальнымі ведамі і векавітай мабільнасцю, мігранты, перш чым уладкавацца і адчуць сябе часткай новай для іх супольнасці, сутыкаюцца са мноствам цяжкасцей. Дзве асноўныя задачы, якія прыходзіцца вырашаць многім новапрыбылым, – гэта нястача моўных навыкаў і ўменняў, а таксама нястача базавых ведаў у фінансавай сферы.






За апошнія два гады International House Minsk супрацоўнічаў з партнёрамі з 11 краін у распрацоўцы навучальных матэрыялаў і ўнікальных методык па выкарыстанні тэатралізаваных гульняў і практыкаванняў для навучання прадстаўнікоў міграцыйных супольнасцяў, якія перададуць свае веды канцавым бенефіцыярам - мігрантам. Сумесна распрацоўваліся навучальныя і інфармацыйныя матэрыялы. Усё гэта было зроблена, каб дапамагчы мігрантам адаптавацца, у прыватнасці, у фінансавых пытаннях.

## CD - Комплекс інтэграцыі мігрантаў

Партнёрамі праекта была распрацавана фінальная версія **CD "Матэрыялы для навучання мігрантаў асноўным навыкам у вырашэнні фінансавых пытанняў"**, які ўключае навучальныя матэрыялы, карысную інфармацыю пра фінансавыя арганізацыі і інфармацыйныя рэсурсы па фінансавых пытаннях ва ўсіх краінах-партнёрах. Распрацаваны CD уключае наступныя навучальныя матэрыялы:

- спіс ключавых карысных слоў і выразаў на ангельскай, літоўскай, нямецкай, нідэрландскай, польскай, грэчаскай, іспанскай, румынскай, беларускай і турэцкай мовах;
- розныя сітуацыйныя дыялогі, якія тычацца фінансавых і сацыяльных пытанняў для мадэлявання рэальных жыццёвых сітуацый такім чынам, каб павялічыць ўменні і ўпэўненасць пры вырашэнні асабістых пытанняў у новай краіне;
- пэўная інфармацыя і парады па вырашэнні штодзённых фінансавых пытанняў у краінах-партнёрах;
- спасылкі на слоўнікі. На CD таксама прадстаўлены спасылкі на міграцыйныя супольнасці ў краінах-партнёрах, фінансавыя рады, якія ўлічваюць спецыфіку пэўнай краіны, прыклады станоўчай практыкі.






***Вы б хацелі бясплатна атрымаць дадзены CD? Тады звяртайцеся ў International House Minsk.***

Сайт праекта www.integra-project.eu

Да канца праекта сайт праекта будзе перайначаны. Спіс карысных слоў і фраз будзе пашыраны тэрмінамі на некалькіх дадатковых мовах, такіх як: балгарская, руская, пушту, дары і арабская. Сцэнары мадэльных сітуацый будуць дапоўнены сітуацыйнымі дыялогамі, якія мадэлююць рашэнні фінансавых і сацыяльных пытанняў. На сайце будуць размешчаны новыя прыклады станоўчай практыкі, набытай странамі-партнёрамі, а таксама дада-тковая інфармацыя, каб дапамагчы мігрантам асвоіцца ў новым для іх грамадстве.

http://www.integra-project.eu